# Апошні астравок самабытнасці

600 гадоў мінула з той пары, як у лясах сённяшняй Белавежскай пушчы з'явіліся першыя прыметы запаведнага рэжыму. Сёння ж Белавежская пушча, як та дарога ў жыцці, у кожнага свая. Для малых— гэта маёнак беларускага Дзеда Мароза, для эколагаў — невычэрпная крыніца названія, а для кагосьці — проста прыгажосць і непаўторнасць некранутай прыроды, і толькі ў адным усе пагаджаюцца — гэта сапраўдны цуд прыроды. Дарэчы, не толькі ў разуменні саміх беларусаў. Праведзенае швейцарскім некамерцыйным фондам інтэрнэт-галасаванне на вызначэнні сямі прыродных цудаў свету "прысудзіла" Белавежскай пушчы 4-е месца сярод 70 намінатаў і самым паставіла Белавежскую пушчу па значнасці на адну прыступку з такімі непаўторнымі мясцінамі, як лясы Амазонкі.

Калі ж гаварыць мовай афіцыйнай, то Белавежская пушча сёння нызначаецца як гістарычны, культурны, эколагаасветніцкі, прыродны комплекс, які мае сусветнае значэнне.

— Гэта вельмі важная дата, якая яшчэ раз падкрэслівае экалагічную значнасць Белавежскай пушчы. 600 гадоў назад гэты лес гэтак жа называўся пушчай і тут былі ўведзены пэўныя абмежаванні на выкарыстанне і эксплуатацыю лясоў, — падкрэсліў Міхаіл Яфімавіч Нікіфараў, генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах НАН Беларусі. — Характарызуючы сённяшні прыродны стан Белавежскай пушчы, можна сказаць, што гэта старажытны некрануты лес, па праве можа лічыцца эталонам лясоў, што калісці раслі на большай частцы сучаснай Еўропы. Менавіта ў гэтым прыцягальная сіла Белавежскай пушчы. Экалагічная і навуковая значнасць пушчы прыцягвае сюды навукоўцаў з усяго свету. Сёння Белавежскую пушчу можна параўнаць і з амазонамі, джунглямі і з трапічнымі лясамі Мадагаскара, бо гэта апошнія астраўкі, якія ў найменшай ступені падвергліся змяненням з боку чалавека. І тое, што на самай населенай, самай абжытай тэрыторын, якой з'яуляецца Еўропа, захаваўся такі куток, — велізарная заслуга тых людзей, якія ў розныя часы на працягу стагоддзяў прыкладалі свае намаганні, каб гэтая тэрыторыя захавалася ў тым выглядзе, якую мы бачым сёння фактычна сюды едуць людзі з усяго свету, каб убачыць, як выглядала іх зямля ў далёкія часы.

Сама Белаважская пушча — гэта музей пад адкрытым небам, паколькі ўсё тут мае гістарычную значнасць. Каштоўнасць не проста ў старых дрэвах, а ў тым, што гэтыя дрэвы раслі там заўсёды: адны паміралі, на змену ім прыходзілі другія. У іншых жа лясах, дзе прыклаў руку чалавек, няма тых дзясяткаў і соцен найдрабнейшых мікраарганізмаў, якія і ствараюць непаўторны арганізм старажытнага лесу.

Да таго ж Белавежская пушча, канечне, багатая шматлікімі відамі раслін, жывёл, але самае галоўнае яе багацце і ўнікальнасць у тым, што тут яны сабраны ў супольнасць, якую немагчыма знайсці ў якім-небудзь іншым месцы. Таму і едуць сюды навукоўцы, каб паглядзець на гэты эталон прыроды, параўнаць з сваей тэрыторыі. Таму і прыкладаецца сёння вельмі шмат намаганняў, каб не проста "закансерваваць" гэты лес, а каб людзі ўбачылі гэты цуд прыроды і імкнуліся захоўваць яго надалей.

Дарэчы, у плане прыцягвення турыстаў на гэты сапраўды непаўторны аб'ект у апошні час робіцца вельмі многа. Той, хто даўно не быў у Белавежскай пушчы, будзе прыемна здзіўлены зменамі, што там адбыліся. Перш за ўсё змяншася вонкавае аблічча прылеглых тэрыторый інфраструктуры самой пушчы. Літаральна днямі адкрыла свае дзверы гасцям высокага ўзроўню, рэканструктаваны рэстаранны комплекс. У цэлым сёння Белавежская пушча можа прыняць адначасова да 250 чалавек. Былі рэканструктаваны дэманстрацыйныя вальеры, праведзены шмат мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні і самой Белавежскай пушчы і прылеглых тэрыторый.

Аднак матэрыяльны дабрабыт - далека не пытанне, на вырашэнне якога апошнім; часам былі накіраваны значныя рэсурсы і сілы. У падрыхтоўцы да святкавання 600-годдзя пушчы прынялі ўдзел каля 30 розных ведамстваў,

органаў дзяржаўнага кіравання. За час падрыхтоўкі быў праведзены целы шэраг мерапрыемстваў па стварэнні новых аб'ектаў. Адзін з асноўных — Музей прыроды Белавежскай пушчы. Раней гэты аб'ект займаў каля 750 квадратных метраў, цяпер яго плошча будзе складаць 1500 квадратных метраў. Па меркаванні навукоўцаў, гэта будзе адзін з самых вялікіх экалагічных музеяў на тэрыторыі краіны. З навуковага пункта погляду быў падняты і апрацаваны вельмі вялікі пласт матэрыялаў гістарычнай значнасці. Гэта тычыцца і дакументаў, і гістарычных раскопак. Выдадзены шэраг выданняў, прысвечаных Белавежскай пушчы, на беларускай, рускай, англійскай мовах.

Была праведзена вялікая работа па навуковай папулярызацыі Белавежскай пушчы, яе вынікам стала навуковая канферцыя з прыцягненнем навукоўцаў з розных краін.

— Дзякуючы праведзеным мерапрыемствам Белавежскую пушчу ўдалося ўзняць на цэлы клас вышэй, чым некалькі гадоў назад, — падкрэсліў Мікалай Мікалаевіч Бамбіза, генеральны дырэктар Нацыянальнага парку "Белавежская пушча". — Вялікае дасягненне ў тым, што па патрабаванні Савета Еўропы Рэспублікі Польшча ў хуткім часе аб'явіць усю тэрыторыю Белавежскай пушчы Нацыянальным паркам. Сёння ж Нацыянальны парк "Белавежская пушча" займае 167 тысяч гектараў, а Нацыянальны парк у Польшчы — 10 тысяч 200 гектараў, хоць усяго на тэрыторыі Польшчы Белавежская пушча займае 62 тысячы гектараў. У хуткай будучыні гэта будзе адзін запаведны лес, што бяспечна, пойдзе толькі на карысць усяму прыроднаму комплексу.

Праведзеная работа паспрыяла і павелічэнню колькасці турыстаў, якія наведалі Белавежскую пушчу. За мінулы год тут пабывала каля 280 тысяч чалавек, гэта ў два з паловай раза больш, чым у папярэднія гады. Але на гэтым работа па добра ўпарадкаванні, эколагаасветніцкай дзейнасці прыродаахоўнага комплексу не спыняецца.

Нам пакуль не ўдалося пабудаваць этнаграфічную веску, як планавалася раней, - заўважыў Мікалай Мікалаевіч. — Але гэтая задумка вельмі добрая, і мы плануем яе ўсе ж такі ператварыць у жыццё. Да таго ж па прапанове Кіраўніка дзяржавы вакол Белавежскай пушчы будзе створана сацыяльна-экалагічнае кальцо. Будзе ўстановлена мяжа, праз якую чалавеку праход забаронены, а на ўскраінах будзе развівацца турыстычны бізнес.

У перспектыве і развіцце дзіцячага турызму. "Мы вывучылі вопыт нацыянальных паркаў Германіі, Чэхіі, Францыі па гэтым пытаны, — расказаў генеральны дырэктар Нацыянальнага парку, — і многае пераняли ад іх. Цяпер другая гасцініца, якая знаходзіцца ў Камянюках, перабудоўваецца спецыяльна для дзяцей, падлеткавай моладзі і студэнтаў. Тут будуць створаны ўсе ўмовы і па пражыванні, і па харчаванні, і па абслугованню моладзі. Да таго ж распрацоўваюцца шматлікія турыстычныя маршруты рознай накіраванасці.

Дарэчы, і сёння дзеці і падлеткі — адны з пастаянных наведвальнкаў Белавежскай пушчы. Па словах Таццяны Мікалаеўны Кавалёвай, намесніка Міністра адукацыі, шырокае святкаванне 600-годдзя Белавежскай пушчы дало магчымасць яшчэ больш актывізаваць і пашырыць удзел дзяцей у экалагічным руху.

— Рэспубліканскі фестываль "Прырода Белавежехай пушчы вачамі дзяцей" яшчэ ў красавіку ў кожнай школе краіны, - расказала Таццяна Мікалаеўна. — Тыдзень назад былі падведзены яго вынікі, было прааналізавана больш як 2700 работ рознай накіраванасці і ўзнагароджаны 102 лепшыя навучэнцы па 9 конкурсах і 27 намінацыях. Гэта і тэатральная, і літаратурная творчасць, і конкурс экалагічнага плаката, і мноства іншых напрамкаў. Цэнтральным мерапрыемствам стала выстава вырабаў з прыроднага матэрыялу, сярод якой — аб'ёмныя выявы жыхароў Белавежскай пушчы, фларыстычныя пано "Зямля — наш дом". Дзве лепшыя работы былі падараваны Белавежскай пушчы і стануць першымі экспанатамі абноўленага Музея прыроды. Яшчэ адным з напрамкаў гэтага фестывалю — распрацоўка эколага-краязнаўчага маршруту, прычым неабавязкова па Белавежскай пушчы, бо па ўсёй Беларусі шмат запаведных і прыгожых месцаў. Гэтыя маршруты ў картах, схемах, фатаграфіях былі прадстаўлены на фестывалі і сталі асновай практычнай экспедыцыі "Здаровае лета", якую мы правялі ў чэрвені. Спадзяёмся, што яны стануць маршрутам для будучых экскурсій. У выніку праведзенага конкурсу фотаздымкаў экалагічнага маршруту ў Нацыянальным парку мы маем велізарны запас цікавых дзіцячых фотаздымкаў, якія па сваім настроі, сюжэтах могуць нават паспрачацца з прафесійнымі фота.

Напэўна, дзіця можа так шкава і незвычайна ўбачыць звычайныя рэчы.

Многія з гэтых работ можна будзе ўбачыць з 20 кастрычніка ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, дзе плануецца адкрыць выставу работ дзяцячай мастацкай творчасці "Табе прысвячаю, Белавежская пушча".

Што да мерапрыемстваў, якія будуць ладзіцца непасрэдна ў дзень святкавання 600-годдзя Белавежскай пушчы, то арганізатары таксама абяцаюць шмат цікавага і непаўторнага. Рыцарскія клубы, горад майстроў, канцэрты айчынных і замежных артыстаў, знакамітыя госці, сярод якіх А.М.Пахмутава і М.М.Дабранраваў, чыя песня стала сапраўдным сімвалам пушчы, славутая тэлеперадача “У свеце жывел” і яе вядучы М.Драздоў – адным словам, сумаваць гасцям не давядзецца.

***А.Маркевич***

**Источник:** Настаўніцкая газ.-2009.-1 кастр.-С.2.